# ТРУМЭН ГАРЫ (1884-1972)

33-й прэзідэнт ЗША (1945-1953 гг.)



Нарадзіўся *8 мая 1884 г. у горадзе Ламар* (штат Місуры) у сям'і фермера. Пасля заканчэння школы не змог працягнуць адукацыю, бо бацька згалеў на біржавых спекуляцыях.

Гары быў клеркам, бухгалтарам, фермерам. Потым стаў саўладальнікам крамы, аднак *эканамічны спад 1921-1922 гг.* прывёў яго да банкруцтва.

Трумэн не толькі цалкам згалеў, але і застаўся павінен 25 тыс. доляраў, якія выплачваў у наступнае дзесяцігоддзе.

У маладосці Гары Трумэн ўдзельнічаў у Першай сусветнай вайне.





У *1926- 1934 гг. — старшыня акруговага суда ў штаце Місуры, у 1934-1944 гг. — сенатар.*

На пасадзе сенатара *падтрымаў «Новы курс» Ф. Рузвельта.* Поспехі на палітычнай ніве адкрылі Трумэну дарогу да паста віцэ-прэзідэнта *(1944 г.).*

У пасаду прэзідэнта ён уступіў *12 красавіка 1945 г. пасля смерці Рузвельта*.

Імкнучыся захаваць жыцці амерыканскіх салдат, прыняў рашэнне аб *ядзернай бамбардзіроўцы Японіі (жнівень 1945 г).*

# Гары Трумэн і Франклін Рузвельт





У *1947 г.* ён заклікаў кангрэс аказаць Грэцыі і Турцыі ваенную і эканамічную дапамогу, каб зберагчы іх ад камуністычнага ўплыву *(«дактрына Трумэна»)*.

ЗША сталі дамінуючай сілай у раёне Міжземнамор'я і абавязаліся даць увесь свой эканамічны патэнцыял для стрымлівання камунізму.

# Гары Трумэн падпісвае дакумент аб стварэнні НАТО





Працягам *«дактрыны Трумэна»* стаў *«план Маршала»,* заклікаНы прадухіліць эканамічны застой у Заходняй Еўропе і спыніць эканамічны хаос, які ў Вашынгтоне разглядалі як пажыўнае асяроддзе для камунізму.

Трумэн санкцыянаваў распачатую сенатарам Дж. Макарці цкаваньне амерыканскіх грамадзян, западозраных у сімпатыях да СССР. Ён быў адным з самых непапулярных прэзідэнтаў у гісторыі ЗША.

# Гары Трумэн і Іосіф Сталін





У снежні 1951 г. толькі 23 працэнты амерыканцаў станоўча ацанілі яго дзейнасць.

Памёр 26 снежня 1972 г. у Канзас-Сіці (штат Місуры).